УДК (070 + 94) (476) "15/16"

# "САБАК, КАТОЎ, ШЧУРОЎ ЕЛІ…". ГОЛАД У МАСКОЎСКІМ КРАМЛІ (1611–1612 гг.): СВЕДЧАННІ СУЧАСНІКАЎ ПАДЗЕЙ

**Еўмянькоў Віталь Іванавіч**

кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры літаратуры і міжкультурных камунікацый
Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова
(г. Магілёў, Беларусь)

Своеасаблівым падагульненнем "маскоўскай тэмы" ў польскамоўных выданнях пачатку XVII ст. з'яўляецца ўлётка, якая выйшла ў 1613 г. і мела назву "Гісторыя жаўнераў абодвух народаў у сталіцы маскоўскай: гэта значыць цярпенне імі нязносных пакут падчас цяжкай аблогі, голаду, жабрацтва, холаду, частых варожых штурмаў з вялікім праліццём крыві. Каротка апісаная для ведама супольнасцям каронным і ўсёй Рэчы Паспалітай у 1613 г.". Хутчэй за ўсё, гэта познаньскае выданне, хоць на тытуле месца друку не пазначана.

Апавяданне ў дакуменце канцэнтруецца галоўным чынам вакол падзей красавіка 1611 г. Перадусім паведамляецца пра крытычнае становішча, у якім апынуўся маскоўскі гарнізон, атачаны войскамі Ляпунова і Трубяцкога. У прыватнасці, падаецца інфармацыя пра адну з лакальных сутычак, якая адбылася на Святога Яна, 24 чэрвеня. Гэта той эпізод, калі ў Маскву вярнуліся сапегавы харугвы, прывёўшы папаўненне і даставіўшы сякі-такі правіянт. Улётка згадвае імёны і прозвішчы загінуўшых, а таксама тых, хто камандаваў войскам Рэчы Паспалітай у бітве. "Ужо вежу пана Бабоўскага, якая была каля белага мура, узялі. Аднак таварыства назад у тую браму ўскочыла і маскву ў пень выцяла" [3, с. 8].

Як вынікае са зместу выдання, на пачатку ліпеня становішча польскага гарнізона ў Маскве было ўжо найскладаным ("акружаныя з усіх бакоў"). Паведамляецца, напрыклад, пра тое, што "немцаў забіта дужа шмат" (гутарка пра наймітаў, якія перайшлі на бок Ст. Жалкеўскага пасля Клушына). Удзельнік тых падзей, шляхціц Самуэль Маскевіч, піша пра тое, што "нашы немцы", колькасцю каля трох соцень, абаранялі муры каля Мікульскай вежы. "Той мур, <…>, магутна штурмавала Масква. Мы толькі глядзелі, бо дапамагчы не было як. Праўда, каб быў у немцаў порах, яны б адбіліся. Усяго толькі з бочку яго мелі, бо не чакалі так хутка ворага. Пастралялі той порах да апошняй жмені і ўжо мусілі камянямі, цэглай з гары бараніцца. Узялі іх, без перабольшвання, голымі рукамі, або на абяцанку. І хаця жывымі ў абоз завялі, там, аднак, адным галовы паадсякалі, а другіх утапілі" [1, с. 61]. А вось што паведамляе "Passia żołnierzow…" у працяг гісторыі супрацьстаяння:

"Забралі яны ў нас усе белыя муры ды так, што з замка і носа высунуць не маглі мы. Толькі, узняўшыся на Іванаву вежу, магчыма было агледзецца і зразумець, што ў свеце адбываецца" [3, с. 8]. Крытычная сітуацыя прымусіла замкавую залогу ісці на хітрасць. "Пан Рэферэнт літоўскі [Аляксандр Корвін Гансеўскі. – *В.Е.*], чалавек рыцарскі і патрыёт айчыны, распачаў перамовы з яго міласцю Аляксандрам Збароўскім і з яго міласцю панам Струсем. Шукалі яны спосабу, каб неяк ад Ляпунова [Пракоп Пятровіч Ляпуноў. – *В.Е.*] пазбавіцца. Заплацілі шасці масквіцінам, каб тыя па замкам ездзілі з лістамі ад імя Ляпунова. У лістах тых было напісана, нібыта Ляпуноў загадвае лавіць і біць данскіх казакаў, а яны на той час большую частку маскоўскага войска складалі. <…> Казакі з вялікім гневам у Ляпунова пыталіся, за што ты нас загадваеш забіваць і граматы па дарогах рассылаеш?" [3, с. 9]. Завяршылася гэта, паводле выдання, смерцю Ляпунова, якога разгневаныя казакі "засеклі", пасля чаго "Масква сэрца страціла".

Праўда, разгубленасць у маскоўскім абозе была непрацяглай. Пасля смерці Ляпунова, насуперак чаканням знясіленай залогі, колькасць штурмаў крамлёўскага замка павялічылася. Аўтар улёткі паведамляе: "<…> вораг розных спосабаў шукаў, спадзяваўся ўзяць нас зморам, знясільваючы частымі штурмамі. У такім становішчы ўсе мы пачалі губляць надзею" [3, с. 11]. На свята Унебаўзяцца Найсвятой Дзевы Марыі "<…> спадзяваліся мы ўпусціць сваіх, якія разам з сапегавымі харугвамі за правіянтам хадзілі, <…>, мы пад белы мур выйшлі, пачалі з масквой перастрэлку і нават урукапашную сыходзіліся. Працягвалася бітва да вечара. Пан Бог блаславіў нас – забралі мы ў масквы палову белых муроў і вежу разам з 150 маскавітамі спалілі. І такім чынам перамогу атрымалі і сваіх разам з правіянтам у месца ўпусцілі" [3, с. 11]. Заўважым, што С. Маскевіч паўтарае гэту інфармацыю ледзь не слова ў слова.

Наступныя падзеі адбыліся праз два тыдні пасля дня Святога Барталамея (адзначаецца 24 жніўня). Аўтар улёткі паведамляе, па-першае, пра тое, што "быў падпалены Кітайгорад", па-другое, пра з'яўленне пад Масквой гетмана літоўскага Яна Караля Хадкевіча з невялікім войскам. Да моманту прыходу Хадкевіча, інфармуе дакумент, пачаўся жахлівы голад у замку. Цытуем выданне:

"<…> голад быў такі, што людзі паміралі. Елі тое, што здолелі дастаць: сабак, катоў, шчуроў, здаралася, і людзей. Аднойчы прыйшлі немцы да суддзі вайсковага пана Аляксандра Кавініцкага – у справах рыцарскіх і судзебных дасведчанага – скардзіліся на голад. Ён нічога не мог даць ім, апроч двух вязняў, потым яшчэ трох. Таксама калі каго заб'юць падчас бою, яго забіралі як пахолкі, так і немцы для харчавання. Нясцерпны голад сярод паноў вялікіх быў гэтакі ж самы, як і сярод простых жаўнераў. Аднойчы прыйшло рыцарства да яго міласці пана рэферэнта літоўскага і да яго міласці пана Збароўскага. Той апошні загадаў сталы накрываць і запрасіў гасцей на банкет. Такімі стравамі частаваў: сухарамі заплеснелымі з хрэнам, квасам або, хутчэй, вадой замест віна. Жаўнеры адзін з адным ціхусенька перамовіліся, з'елі крыху тых гасцінцаў і вярнуліся на муры" [3, с. 13].

Сітуацыя пагоршылася тым, што ў бок Масквы рухалася новае войска на чале з Пажарскім. Улётка паведамляла пра сакрэтныя перамовы паміж Гансеўскім і данскім атаманам Заруцкім, якому была паабяцаная падтрымка з боку караля з адной, аднак, умовай. Зарзуцкі мусіў крыж цалаваць і прысягнуць Ілжэдзмітрыю. Калі верыць дакументу, казацкі атаман прыслухаўся да парады Гансеўскага. "Пажарскі пачуў пра гэта ў дарозе і надзвычай моцна разгневаўся" [3, с. 14].

"Passia żołnierzow…" пазначае перыяд голаду ў маскоўскім замку – ад Святога Міхаіла, гэта значыць – ад 29 верасня. "Толькі яго міласць пан гетман літоўскі крыху ежы прывёз", - піша аўтар. Заўважым яшчэ раз тое, што Хадкевіч прыйшоў пад Маскву на пачатку кастрычніка 1611 г. Улётка паведамляе пра канфедэрацыю, якую абвясціла частка залогі. "Пастанавілі панове-канфедэраты пакінуць сталіцу, бо не атрымлівалі яны грошай і не мелі якога б там не было плану дзеяння" [3, с. 14]. Канфедэраты сышлі разам з Хадкевічам. Засталася купка рыцараў ("шэсць палкоў сапегавых") на чале са старастам хмяльніцкім Струсем і Збароўскім.

Па сутнасці ўчынак гэтых людзей быў падобны да самазабойства. Хаця Ю. Нямцэвіч піша пра тое, што ні Струсь, ні сапегавы воі тады яшчэ не маглі ведаць пра страшныя наступствы свайго "маскоўскага сядзення". С. Маскевіч называе іншую прычыну канфедэрацыі і адыходу жаўнераў з Масквы – у прыватнасці, нежаданне каранняжаў падначальвацца літоўскаму гетману, а таксама празмерная, на думку некаторых, суровасць Хадкевіча, які наводзіў у войску жалезную дысцыпліну [1, с. 69]. Дарэчы, сам аўтар дыярыўша сыйшоў з Масквы, хаця і не надоўга – ужо ў снежні ён вярнуўся ў складзе аддзела Карэцкага, прывёзшы землякам правіянт.

Вяртаючыся да эпізоду, звязанага з голадам у маскоўскім замку, варта ўсё ж высветліць, наколькі інфармацыя, змешчаная ў "Passia żołnierzow…" праўдзівая. Бо, падкрэслім, гутарка ў дакуменце пра людажэрства. Заўважым тое, што С. Маскевіч таксама паведамляе пра "вялікую нястачу і галечу" ў Маскве, аднак пра людажэрства ўсё ж не згадвае. Праўда, С. Маскевіч сышоў з Масквы значна раней, чым голад авалодаў замкам напоўніцу. Найбольш красамоўна тыя падзеі апісвае Ю. Нямцэвіч, праўда, яго звесткі маюць дачыненне да перыяду пасля лістапада 1611 г. Цытуем польскага гісторыка, які хутчэй за ўсё спасылаецца на дыярыўш палкоўніка Юзафа Будзілы, яшчэ аднаго сведкі тых падзей:

"Тым часам пакінутае на мурах сталіцы войска Струся і шэсць сапегавых палкоў зрабіліся сведкамі самых жахлівых наступстваў голаду. Сціскаецца сэрца пры апісанні пакут, якія тыя нешчаслівыя зносілі. <…>. Калі ўжо травы, карэння, палё-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вак, сабак, катоў, конскай паданіны, выкапаных з зямлі нябожчыкаў стала не хапаць, калі з рамянёў было ўжо ўсё прыгатавана і з'едзена, звар'яцелыя ад голаду вочы шукалі ахвяраў сярод жывых. Змоўкла прырода, зніклі ўсе повязі сваяцтва і разуменне субардынацыі, звычаем драпежнага звера сільны ўзнімаўся на слабога, забіваў, зжараў. Маткі гінулі ад рук сыноў, сыны ад рук бацькоў, слугі пажыралі ўласных паноў. Шмат хто сыходзіў з муроў, каб скласці галаву ад рукі ворага" [2, с. 33]. Іншымі словамі, існуе яшчэ як мінімум адна крыніца, якая пацвярджае інфармацыю, змешчаную ў аналізуемым намі дакуменце.

Аўтар улёткі і, як вынікае, непасрэдны ўдзельнік тых падзей распавядае пра далейшы лёс тых, хто вырашыў дачакацца каралевіча ў Маскве. "Чаго вораг не мог з намі зрабіць, тое голад лёгка рабіў ды так, што мы ўжо ледзь жывыя былі. Бо ежа наша тагачасная (якой нават на радзіме быдла грэбуе) – гэта карэнне, шчаўе, грыбы…" [3, с. 14]. "Надышоў час, калі мы больш трываць не маглі, выглядаючы падтрымкі, выглядаючы караля нашага міласцівага пана. Прасілі мы гетмана [Яна Караля Хадкевіча. – *В.Е.*], каб прыбыў ён да нас і выратаваў спакутаваных і знясіленых" [3, с. 15]. Аўтар згадвае некалькіх "таварышаў", якім было даручана прабіцца скрозь маскоўскую заслону. "Рыцары вялікага сэрца", паны Драздоўскі, Алецкі і Яраш Пашкоўскі, рызыкуючы жыццём, прабіраліся па шляхах, якія масква вартавала. Нарэшце, замкавая залога даведалася пра тое, што Хадкевіч "ідзе да нас". Адбывалася ўсё гэта ў канцы восені або на пачатку зімы. Аўтар паведамляе пра тое, што Яраш Пашкоўскі вяртаўся ў Маскву на лыжах ("на лыжах пайшоў у бок сталіцы").

Наступны эпізод, які знайшоў адлюстраванне ў "Passia zołnierzow…", мае дачыненне да фіналу "маскоўскай эпапеі" войска Рэчы Паспалітай. "Пасля прыбыцця гетмана, аддалі мы яму сталіцу, якую ён і асадзіў свежымі сіламі. Не пакідаючы яшчэ горад, паабяцалі мы яго міласці гетману ісці ў бой, спрабаваць шчасця з ворагам. І абяцанне сваё мы выканалі. Сам пан Збароўскі наперадзе харугваў падступіўся да астрожка, дзе вялікія сілы масквы былі. Там жа яму нагу прастрэлілі, як рыцарства, так і пахолкаў шмат забілі". Цяжка сказаць, пра якую менавіта бітву вядзецца тут гутарка. Магчыма, маецца на ўвазе няўдалая спроба Хадкевіча прабіцца ў Маскву на пачатку верасня. Аднак усё ж з большай верагоднасцю можна меркаваць пра тое, што аўтар мае на ўвазе падзеі пярэдадня капітуляцыі замкавага гарнізону (7 лістапада 1612 г.). Магчыма, гутарка пра штурм казакамі Трубяцкога Кітайгораду, які адбыўся, паводле Ю. Нямцэвіча, 1 лістапада і меў жахлівыя вынікі для знясіленых палякаў.

Далейшыя падзеі сумненняў ужо не выклікаюць. Аўтар улёткі распавядае пра выхад рэшты войска на чале са Струсем з Масквы. "Як толькі мы са сталіцы выйшлі, тры тысячы рыцарства было забіта. Усе іх імёны тут не згадаць. Магчыма, у вольны час і ў больш змястоўным пісьме ўсё куды падрабязней выкладу" [3, с. 15]. Згадвае ўлётка толькі гібель "зацных ротмістраў" паноў Гваздзікоўскага і Станіслава Рагоўскага. "Выйшаўшы са сталіцы, рушылі мы ў дзень Божага цела ў бок Польшчы, адбылося гэта ў 1612 г. Церпячы ад нязноснага голаду і сілкуючыся толькі пустазеллем, дайшлі да Мажайска" [3, с. 15].

Ю. Нямцэвіч піша пра тое, што маскавіты пад прысягай абяцалі палякам пакінуць жыццё і маёмасць, а таксама не перашкаджаць у іх вяртанні да дому. "Толькі палякі апынуліся на схіле, адразу ж Струсь і іншыя палкоўнікі былі арыштаваныя і патрапілі ў турму. Рыцарства ж было выцята, задушана, а некаторыя ў хвалях рачных канец свайго нешчаслівага жыцця знайшлі" [2, с. 15].

Звяртае на сябе ўвагу стылёвая блізкасць выдання да дыярыўшаў пачатку XVII ст. (С. Маскевіч, Ю. Будзіла, А. Радзівіл і інш.). Апавяданне вядзецца ад першай асобы. Аўтар не толькі фіксуе падзеі, але і не саромеецца выказваць уласнае меркаванне. Здзіўляе яго абазнанасць у самых дробных дэталях ваеннай кампаніі. Усё гэта дазваляе меркаваць пра тое, што невядомы аўтар – удзельнік маскоўскай выправы, прычым ад яе першага этапу да апошняга. Пэўная незадаволенасць каралём выдае ў ім былога ракашаніна. Магчыма дапусціць тое, што асноўная мэта выдання – ідэалагічная. Улётка тлумачыла маскоўскі паход не як самавольства пэўнай групы шляхты ў імя рабункаў і асабістай славы (погляд канцылярыі караля на факт падтрымкі Ілжэдзмітрыя II), а як подзвіг і ахвярнасць у імя Рэчы Паспалітай.

ЛІТАРАТУРА


1. *Maskiewicz, S.* Pamiętniki. Początek swoj biorą od roku 1594 w lata po sobie idące / S. Maskiewicz // Wydane z rękopisow Biblioteki Szezorsowskiej Hrabiego Chreptowicza przez Jana Zakrzewskiego radcę dworu, nauczyciela gubern. Wilen. gimnazium. – Wilno : Nakładem i drukiem Teofilą Glucksberga, 1838. – 112 s.
2. *Niemcewicz, J. U.* Dzieje panowania Zygmunta III, krola polskiego, Wgo Księcia litewskiego, ruskiego, pruskiego, Mazow. Żmudz. Kiiows. Wołyns. Podols. Podlas. Smolens. Siewiers. Inflantsk. i Czerniechowskiego, dziedzicznego Krola szwedow, gotow i wandalow : w 3 t. / J.U. Niemcewicz. – Wrocławl : Nakładem Zygmunta Schlettera, 1836. – T.3. – 450 s.
3. Passia zołnierzow Oboyga Narodow w stolicy moskiewskiey: to iest wytrzymanie nieznośnych stosow w oblęzeniu ciężkim, głodu, nędze, zimna, szturmy nieprzyjacielskie częste, z wielkim krwie ich przelaniem. Krotko opisana dla vwazenia Stanom Koronnym y wszystkiey Rzeczypospolitey w Roku1613 [Электронный ресурс] // Cyfrowa Biblioteka Drukow Ulotnych Polskich i Polski Dotyczących z XVI, XVII i XVIII Wieku. – Рэжым доступу: http://cbdu.ijp-pan.krakow.pl/3180/. – Дата доступу: 09.08.2016.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова